**ЧЛЕН СКАЗА** – матэрыяльна-выражаны кампанент сказа (слова, спалучэнне слоў), які адначасова з'яўляецца і элементам структуры, і носьбітам семантыкі сказа. Член сказа можа быць марфалагізаваным або немарфалагізаваным.

**Марфалагізаваны член сказа** – член сказа, выражаны той часцінай мовы, для якой пэўная сінтаксічная функцыя з'яўляецца асноўнай (тыповай, традыцыйнай). Марфалагізаваныя дзейнікі выражаны назоўнікамі, займеннікамі ў назоўным склоне, марфалагізаваныя выказнікі выражаны асабовымі дзеясловамі: ***Гудзе** і **звініць*** *пасека* (А. Якімовіч); *Але **плыве** і **плыве** вялікая рака* (У. Караткевіч); *Я **спыніўся**, аслеплены сонцам, толькі на ўзлеску, перад полем* (Б. Сачанка).

Марфалагізаваныя дапаўненні выражаны назоўнікамі і займеннікамі ва ўскосных склонах, марфалагізаваныя азначэнні – прыметнікамі, займеннікамі, парадкавымі лічэбнікамі, поўнымі дзеепрыметнікамі, марфалагізаваныя акалічнасці – прыслоўямі, дзеепрыслоўямі: *Непрыкметна ачысціліся ад снегу палі і лясы* (Р. Ігнаценка); *Уначы першы мароз абпаліў асеннія травы* (І. Шамякін).

**Немарфалагізаваны член сказа** – член сказа, выражаны той часцінай мовы, для якой пэўная сінтаксічная функцыя з'яўляецца не тыповай.

Немарфалагізаваныя дзейнікі выражаны, напрыклад, інфінітывамі, немарфалагізаваныя выказнікі – назоўнікамі ў назоўным і ўскосных склонах, немарфалагізаваныя дапаўненні – інфінітывамі, немарфалагізаваныя азначэнні – ускосна-склонавымі формамі назоўнікаў, інфінітывамі і інш., немарфалагізаваныя акалічнасці – інфінітывамі, ускосна-склонавымі формамі назоўнікаў: *Прафесія настаўніка не з лёгкіх...* (Я. Ермаловіч). *Падрыхтаваць цікавы даклад – справа нялёгкая* (А.Кулакоўскі). *Жыццё вучыць нас быць дбайнымі гаспадарамі прыроды...* (Р. Ігнаценка). *Маланя адразу падалася ў будан спаць...* (І. Мележ).

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ